*І. А. ЕЎТУХОЎ, к. г. н., дацэнт БДУ*

# КАНЦЭПЦЫЯ ЧАЛАВЕКА ЦЫРКУМЦЭЛІЁНАЎ

Акрамя антрапалагічных сістэм, замацаваных у рэлігійна-філасофскіх творах, практыцы набажэнстваў, культавым будаўніцтве і г. д., у познеантычным грамадстве выспявалі канцэпцыі чалавека, непасрэдна звязаныя з дзейнасцю непісьменных слаёў насельніцтва. Да сучаснага моманта рэканструкцыя дадзеных сістэм пры дапамозе традыцыйных сродкаў даследвання ўскладняецца з-за адсутнасці значнага масіву наратыўнай інфармацыі.

Як можна меркаваць, шлях да рашэння праблемы ляжыць праз змяненне метадалогіі аналізу. Пры гэтым трэба ўлічваць, што антрапалагічныя ўяўленні народных нізоў познеантычнага грамадства, па-першае, як правіла не выходзілі за межы будзённаэмпірычнай свядомасці, па-другое, не фіксаваліся у пісьмовай форме. Апошні момант, аднак, не азначае, што наогул не было ніякай фіксацыі сістэмы. Проста яе трэба шукаць у іншай знакавай форме.

Відавочна, што прапанаваная метадалогія не забяспечвае дэталёвую рэканструкцыю антрапалагічнай сістэмы, але здольна дастаткова эфектыўна выканаць больш сціплую задачу — даць пэўны стэрэатып паводзінаў.

Вельмі цікавая канцэпцыя чалавека такога кшталту выспела сярод цыркумцэліёнаў (аганістыкаў) рымскай Афрыкі. Знакавай формай яе фіксацыі сталі пэўныя дзеянні з ідэалагічнай афарбоўкай.

Да апошніх, відавочна, трэба аднесці шэраг дзеянняў, згадкі пра якія і пэўнае абгрунтаванне новазапаветнымі тэкстамі ёсць у творах Аўрэлія Аўгусціна: саманазва цыркумцэліёнаў — аганістыкі (барацьбіты) з апорай на перапіску апостала Паўла — «Подзвігам добрым я падвізаюся» (2 Кар. 1: 4); выкарыстанне ў баі, асабліва на першых этапах руху, палак замест мячоў са спасылкай на Евангелле — «Той, хто меч узяў, загіне ад мяча»; самазабойствы; памінкі (convivia) на магілах загінуўшых; баявы кліч Deo laudes (En. in ps. 132, 6; Contr. Litt. Pet. II, 88, 195; 96, 222; De un. Eccl. 19, 50; Serm. 355, 4; En. in ps. 132, 6).

Усе дзеянні, як можна меркаваць, дастаткова адназначна ўказваюць на ваяўнічахрысціянскі характар поглядаў цыркумцэліёнаў, іх зарыентаванасць на барацьбу з д'яблам і яго слугамі. А той факт, што на чале іх баявых атрадаў вельмі часта стаялі данатысцкія святары, дазваляе зрабіць шэраг высноў пра тэарытычную базу поглядаў цыркумцэліёнаў на чалавека. Можна дапусціць, што яна абмяжоўвалася пераказамі асноўных тэзісаў, звязаных з паўночнаафрыканскай хрысціянскай традыцыяй ад Тэртуліяна і Кіпрыяна да Даната. Падставай для гэтага служыць той факт, што данатысты, як і цыркуцэліёны, рэпрэзэнтавалі пунікамоўную частку рэгіёна. Пры гэтым, аднак, атаясамліваць данатыстаў з цыркумцэліёнамі нельга. Другія, па інфармацыі біёграфа Аўгусціна Пасідыя, дастаткова часта наносілі ўдары па першым (Pos. Vit. Aug. 10).

Адной з найбольш характэрных рысаў руху ў пачатку V ст. сталі масавыя самазабойствы цыркумцэліёнаў. Аўрэлій Аўгусцін паведамляе, што яны нападалі на паганскія храмы, разбуралі статуі багоў і правакавалі тым самым парафіян на адпаведныя гвалтоўныя дзеянні супраць іх (Serm. 62, 11, 17). Больш таго, Аўгусцін таксама фіксуе выпадкі, калі цыркумцэліёны пад пагрозай смерці вымушалі прахожых людзей забіваць іх. Забітыя такім чынам цыркумцэліёны шанаваліся як пакутнікі (Ep. 185, 3,12). Былі і звычайныя рытуальныя самазабойствы, помнікамі якіх служаць камені на дне пропасці з іменем, датай і словам гаслоўская традыцыя рэгіёна, вызнаная данатысцкай царквой, а менавіта — падштурхоўванне да пакутніцтва: «Не жадайце паміраць на сваіх ложках у муках нараджэння ці ў ліхаманцы, але жадайце памерці смерцю пакутніка» (Tert. De fug. in pers. 3) і хіліазм: «Там будзе зямля, аднолькавая для ўсіх, жыццё — агульнае, багацце стане непатрэбнымreditum.

Асноўнай праблемай пры аналізе масавых самазабойстваў цыркумцэліёнаў з'яўляецца вызначэнне матывацыі. Так, напрыклад, нельга лічыць вычарпальным меркаванне М.А. Машкіна пра сувязь самазабойстваў з цяжкім паражэнням аганістыкаў у бітве пры Багаі ў 347 г. [1] Аўрэлій Аўгусцін прыводзіць значную колькасць фактаў, якія сведчаць пра вялікі баявы патэнцыял цыркумцэліёнаў і іх здольнасць да актыўных наступальных дзеянняў у пачатку V ст. — «Яны не толькі б'юць нас палкамі і мячамі, але і з неверагоднай жорсткасцю слепяць вочы вапнай, змешаным з воцатам, рабуюць нашыя дамы, ... разбегаюцца па баках, пагражаючы забойствамі, рабункамі, пажэжамі, аслепленнямі» (Ep. 98, 8). Больш карэктным уяўляецца выснова пра рытуальны характар самазабойстваў.

Асновай ідэалогіі цыркумцэліёнаў паслужыла багаслоўская традыцыя рэгіёна, вызнаная данатысцкай царквой, а менавіта – заахвочванне імкнення да пакутніцтва.

Традыцыя, як ўяўляецца, была не толькі ўспрынята цыркумцэліёнамі, але і пераасэнсавана ў праграму канкрэтных дзеянняў: 1) свет гіне ў зле, 2) на зямлі абавязкова запануе царства божае, 3) дзеля яго больш хуткай перамогі трэба, па-першае, павялічыць колькасць дабра на зямлі, у асноўным праз пакутніцтва, па-другое, паменшыць колькасць зла на зямлі праз знішчэнне слуг д'ябла (буйных землеўладальнікаў, іерархаў і клірыкаў рымска-каталіцкага касцёлу).

Разам з пачаткам рэалізацыі акрэсленай праграмы цыркумцэліёны, як падкрэсліваў галандскі даследчык П.Шультэн, пачалі дабраахвотна аддаваць свае жыццё, каб павялічыць агульную колькасць праведнікаў і наблізіць перамогу над злом. Менавіта рытуальныя самазабойствы, на яго думку, дазваляюць правесці мяжу паміж ідэалагічнымі сістэмамі данатыстаў і цыркумцэліёнаў. Першыя пасіўна чакалі царства божага, другія актыўна дапамагалі яго прыходу [2].

Такім чынам, можна вызнаць, што ў нетрах руху цыркумцэліёнаў выспела арыгінальная канцэпцыя чалавека, якая развівалася ў рамках данатызму і фіксавалася ў знакавай форме дзеянняў.

Асноўнай практычнай высновай дадзенай канцэпцыі былі захады, накіраваныя на дасягненне перамогі над злом і паскарэння прыхода царства божага — масавыя самазабойствы і расправы над слугамі д'ябла. П.Шультэн бачыць у апошнім моманце не эсхаталагічныя спадзяванні, але цалкам прыродную патрэбу грамадскіх нізоў ў рэваншы [3].

Жыццё, вартае чалавека, было для цыркумцэліёнаў, па словах Аўгусціна, у наступным: «Яны жывуць як рабаўнікі, паміраюць як цыркумцэліёны, шануюцца як пакутнікі» (Ер. 88, 8). Калі зняць з гэтага тэзіса адмоўныя ацэначныя характарыстыкі, то акрэсліцца наступны стэрэатып паводзінаў антрапалагічнай сістэмы цыркумцэліёнаў: свабоднае жыццё, накіраванае на аднаўленне сацыяльнай справядлівасці, дабраахвотны ўход з жыцця дзеля паскарэння перамогі дабра, шанаванне загінуўшых паплечнікаў.

Спад актыўнасці цыркумцэліёнаў і памяншэнне маштабаў іх дзейнасці звязаны з аслабленнем данатысцкай царквы ў цэлым і адносіцца да 420 г. [4]

[1] Машкин Н.А. Движение агонистиков (Из истории римской Африки IV века) // Историк-марксист. 1935. № 1. С. 32.

[2] Schulten P.G.G.M. De Circumcellionen: Een sociaal-religieuze beweging in de late oudheid. Scheveningen, 1984. Bl. 175.

[3] Ibid.

[4] Loposzko T. Zarys dziejów spolecznych Cesarstwa Rzymskiego. Lublin, 1989. S. 223.